# МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ «УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ»

4 Для аматараў добрага фотамастацтва Дзяніс Бурмакін і Таццяна Косяк падрыхтавалі аўтарскі праект «Гарадскія калейдаскопы». Творцы працуюць у тандэме: Дзяніс здымае краявіды розных краін, пейзажы гарадскога жыцця, а Таццяна фотаздымкі адмыслова апрацоўвае.

Ні намёку на штодзённасць і звыкласць. Аўтары прапануюць гледачам зірнуць на пейзажы з розных бакоў, разглядзець іх структуру, заўважыць дробязі вялікай гарадской прасторы і адчуць сучаснасць вачыма чалавека, які не спяшаецца. «Гарадскія калейдаскопы» дазваляюць хоць на хвілінку апынуцца на вуліцах Барселоны, Будапешта, Стамбула, Вільні і Рыгі, прайсціся па знакавых месцах і ўбачыць вячэрнія агні. З новых ракурсаў фотамастакі адлюстравалі пейзажы Мінска, што захапляюць грацыёзнасцю, багаццем яркіх колераў і прыемнымі ўспамінамі.

У аснове экспазіцыі — тэма павярхоўнага ўспрымання асяроддзя, неразуменне яго адкрытай для ўсіх прыгажосці. Праз фотапалотны творцы даносяць, што жыццё складаецца з каларытных пейзажаў, не заўважаючы якіх мы губляем любоў да роднага горада.



*Гарадскія калейдаскопы 2.*